# Права

*Да 90-годдзя юрыдычнага факультэта*

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

Жыццёвая неабходнасць эфектыўнага функцыянавання дзяржавы і грамадства, патрэбы заканатворчай і праваприымяняльнай дзейнасці заўсёды стымулявалі навуковае развіццё ў галіне права.

Беларуская юрыдычная навука мае глыбокія карані. Калі старажытныя беларускія землі сталі палітыка-эканамічным цэнтрам буйной феадальнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, узнікла і рэалізавалася неабходнасць удасканалення заканадаўства і падрыхтоўкі прафесійных юрыстаў. Асабліва гэта тэндэнцыя праявілася ў XVI ст., калі ў дзяржаве ажыццявіліся кадыфікацыя заканадаўства і шэраг дзяржаўных рэформ – зямельная, адміністрацыйна-тэрытарыяльная, судовая, адукацыйная і інш.

Развіццю права садзейнічала палітыка-прававая думка, якая паслужыла тэарэтыка-ідэалагічнай падставай узнікнення новай, больш прагрэсіўнай грамадскай правасвядомасці. У XVI ст. знакамітыя мысліцелі (Францыск Скарына, Міхалон Літвін, Сымон Будны, Андрэй Волан, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Леў Сапега і інш.) на падставе папярэдніх навуковых напрацовак даследавалі праблемы дзяржавы і права, выносілі прапановы па іх удасканаленні. Усе яны ў той ці іншай ступені былі прыхільнікамі тэорыі натуральнага права, якая ў перыяд Адраджэння і Рэфармацыі шырока распаўсюдзілася ў Еўропе. Так, ідэі Фрынцыска Скарыны знайшлі адлюстраванне ў Статуце 1529 г., у падрыхтоўцы якога ён прымаў удзел, аказалі значны ўплыў на далейшае развіццё не толькі беларускай, але і агульнаеўрапейскай палітыка-прававой думкі.

Актывізацыя навуковай дзейнасці была выклікана практычнымі патрэбамі заканатворчасці, што і знайшло адлюстраванне ў правядзенні на працягу XVI ст. некалькіх агульных кадыфікацый заканадаўства. Сапраўднай рэвалюцыяй у правативорчасці было стварэнне ў Вялікім Княстве Літоўскім Статутаў 1529, 1566, 1588 гг. – першых у Еўропе такога ўзроўню зводаў законаў, заснаваных на мясцовым звычаёвым праве, традыцыях народа і напісаных на старажытнай беларускай мове. Менавіта гэта мела важнае значэнне, бо на той час большасць еўрапейскіх дзяржаў карысталіся рымскім правам і лацінскай мовай. Сістэматызацыя заканадаўства патрабавала перапрацоўкі вялікай колькасці назапашанага ў дзяржаве нарматыўна-прававога матэрыялу, што павялічвала каштоўнасць нацыянальнага права, пашырала сферу дзейснай юрыспрудэнцыі.

Актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху і развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў у канцы XIX – пачатку XX ст. суправаджалася з'яўленнем палітыка-прававых ідэй, якія тычыліся ўзнаўлення беларускай дзяржаўнасці. З'явіліся дзеячы, навукоўцы, пісьменнікі, якія знаходзіліся пад непасрэдным уплывам беларускага нацыянальна-адраджэнскага руху. У Паўночна-Заходнім краі, як афіцыйна называліся беларускія землі, адбыўся значны ўсплёск палітыка-прававой думкі, узрасла цікавасць да ўласнай гісторыі.

Пасля ўстанаўлення савецкай улады ўся прававая навука знаходзілася пад уплывам марксісцка-ленінскай ідэалогіі, што значна перашкаджала яе развіццю. Таксама ў Беларускай ССР айчынныя навукоўцы і дзяржаўныя дзеячы (У. М. Ігнатоўскі, З. Х. Жылуновіч і інш.) перш за ўсё з класавых пазіцый асвятлялі падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянскай вайны, распрацоўвалі гісторыю бальшавіцкіх арганізацый і г. д.

Узнаўленне развіцця беларускай юрыдычнай навукі звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які ўключаў тры факультэты: рабочы, медыцынскі і грамадскіх навук. Самым

буйным і шматпрофільным быў факультэт грамадскіх навук, дзе функцыянавалі чатыры аддзяленні – грамадска-педагагічнае, літаратурна-лінгвістычнае, эканамічнае і прававое (739 студэнтаў). У сувязі з утварэннем універсітэта Наркамат адукацыі РСФСР накіраваў у БССР групу вучоных. Значны ўклад у развіццё прававой навукі ў гэты перыяд унёс першы рэктар БДУ У. І. Пічэта, які кіраваў даследаваннямі і распрацоўваў шматлікія праблемы гісторыі Беларусі. Першымі выкладчыкамі на прававым аддзяленні былі Г. С. Гурвіч (савецкае дзяржаўнае права), У. М. Дурдзянеўскі (дзяржаўнае права буржуазных краін), М. Б. Кроль (судовая псіхіятрыя), І. Т. Цітоў (судовая медыцына), М. В. Грэдзінгер (грамадзянскае права і працэс), Б. В. Чрэдзін (рымскае права) і інш. Дэканам факультэта быў прызначаны прафесар У. М. Ігнатоўскі, а з 1922 г. ім стаў прафесар С. З. Кацэнбоген. Гэта былі яркія, неардынарныя асобы і навукоўцы. Актывізацыі навуковай дзейнасці садзейнічала стварэнне пры БДУ навуковага таварыства, якое мела і юрыдычную секцыю. Да 1930 г. было выдадзена 25 выпускаў навуковых прац. Сярод аўтараў асабліва вылучаліся прафесары У. І. Пічэта, М. В. Грэдзінгер, В. М. Шыраеў і інш.

Навуковыя даследаванні 1920–30-х гг. былі адказам на пытанні, якія ставілі ў той час практыка савецкага дзяржаўнага будаўніцтва і правапрымяняльная дзейнасць. У адкрытым у 1922 г. Інстытуце беларускай культуры была створана камісія па савецкім будаўніцтве (пераўтвораная потым у прававую секцыю), у склад якой увайшлі і юрысты – выкладчыкі БДУ. ЦВК і СНК БССР з мэтай атрымання ад навукоўцаў неабходных рэкамендацый даручылі Інбелкульту вывучэнне пытанняў дзяржаўна-прававога жыцця рэспублікі. Па ўказанні ЦВК БССР інстытут узяў на сябе функцыі вядучай навуковай арганізацыі па даследаванні прычын злачыннасці, а па даручэнні ўрада вывучаў прававыя праблемы землекарыстання і землеўладання, дзейнасці мясцовай гаспадаркі і іншыя пытанні дзяржаўна-прававога будаўніцтва ў Беларусі.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце змяняліся вучэбныя планы, удакладняліся, прыстасоўваліся да новых умоў жыцця вучэбныя праграмы. Так, у 1924 г. была ўнесена прапанова аб абмежаванні лекцыйнай сістэмы выкладання як не вельмі эфектыўнай. Народны камісарыят асветы даў указанне адмяніць лекцыйны метад выкладання і замяніць яго на лабараторна-брыгадны: семінарскія, практычныя заняткі. Новаўвядзенне мела мэтай падрыхтоўку спецыялістаў у найбольш сціслыя тэрміны: замест чатырох-пяці гадоў – тры. Першы выпуск студэнтаў адбыўся ў 1925 г., а за пяць гадоў у БДУ было падрыхтавана 130 юрыстаў.

У 1925/26 навучальным годзе на факультэце працавалі ўжо 12 прафесараў: У. І. Пічэта, С. Я. Вольфсан, А. В. Гарбуноў, М. В. Грэдзінгер, У. М. Дурдзянеўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, С. З. Кацэнбоген, М. М. Краўчанка, М. А. Прыляжаеў, У. М. Перцаў, В. М. Шыраеў, Б. В. Чрэдзін, а таксама дацэнты і асістэнты (А. М. Арцымовіч, Ф. І. Гаўзэ, М. А. Канаплін і інш.). У сувязі з гэтым актывізаваліся навуковыя даследаванні. Так, адзін з першых даследчыкаў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі Р. Я. Парэчын выдаў кнігу «Наша Канстытуцыя» (1928), у якой разглядалася папярэдняе развіццё беларускай савецкай дзяржаўнасці і даваўся аналіз Канстытуцыі БССР 1927 г. Савецкаму дзяржаўнаму праву былі прысвечаны працы У. М. Дурдзянеўскага, М. М. Гуткоўскага, І. І. Крыльцова, М. А. Канапліна, Л. А. Рудзіцкага, П. М. Галанзы. Напрыклад, прафесар М. А. Канаплін і дацэнт Л. А. Рудзіцкі падрыхтавалі манаграфію «Выбары тут і там» (1931), у якой, параўноўваючы савецкую сістэму выбараў з буржуазнай, падкрэслівалі, што апошняя з цягам часу страчвае сваю прагрэсіўнасць. Прыкметны след у юрыдычнай навуцы пакінулі працы М. В. Грэдзінгера, прысвечаныя грамадзянскаму праву і працэсу БССР, В. М. Шыраева – крымінальнаму праву і працэсу, М. М. Краўчанкі, Э. В. Зайчыка – працоўнаму праву, К. І. Таўсталес – шлюбна-сямейнаму і грамадзянскаму праву, Ф. І. Гаўзэ – грамадзянскаму праву і інш.

Навукоўцы займаліся таксама праблемамі ўпарадкавання заканадаўства і яго сістэматызацыі (Ф. І. Гаўзэ, М. М. Гуткоўскі і інш.). Так, значным дасягненнем беларускай юрыдычнай навукі і прыкладам цеснай сувязі навукі і практыкі стала праца М. М. Гуткоўскага «Сістэматычны паказчык (спроба сістэматыкі) заканадаўства Беларускай ССР за 1919–1928 гг.» (1929). У ёй сістэматызацыя заканадаўства дапаўнялася алфавітна-прадметным паказальнікам. Размяшчэнне па пэўнай сістэме больш за 4000 законаў і ведамасных актаў сведчыла аб актыўнай заканадаўчай дзейнасці ў БССР. Старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў у прадмове да працы падкрэсліў, што аўтар паклаў пачатак сістэматызацыі заканадаўства рэспублікі.

У гэты час юрыстаў Беларусі цікавілі таксама пытанні аб прававых формах узаемаадносін савецкіх рэспублік, прыродзе іх дзяржаўнага саюзу, развіцці заканадаўства. Акрамя таго, Інбелкульт пачаў выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI–XVII стст., якія ўваходзілі ў склад Літоўскай метрыкі. Былі выдадзены тры тамы кнігі «Беларускі архіў» (1927–1930). Адметнай з’явай у сферы юрыдычных даследаванняў Інбелкульта сталі «Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права» – збор артыкулаў па розных галінах юрыдычнай навукі: дзяржаўнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, грамадзянскага, зямельнага права, судаводства, гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, якія выйшлі ў 1929 г. (М. В. Грэдзінгер, Р. Я. Парэчын, М. А. Канаплін, В. М. Шыраеў, С. Слупскі, Ф. І. Гаўзэ, М. М. Гуткоўскі, Е. А. Вішнеўскі, Н. А. Бонч-Асмалоўскі). Друкаваліся асобныя кнігі, прысвечаныя грамадзянскаму і грамадзянска-працэсуальнаму праву, крымінальнаму і крымінальна-працэсуальнаму праву, шлюбна-сямейнаму праву і інш. Так, М. В. Грэдзінгер апублікаваў падручнік па грамадзянскім працэсе БССР, В. М. Шыраеў прысвяціў свае працы дзейнасці следчых органаў, органаў суда і пракуратуры, У. М. Дурдзянеўскі, М. А. Канаплін, Л. А. Рудзіцкі, П. М. Галанза – дзяржаўнаму праву.

Значнае месца ў даследаваннях правазнаўцаў БДУ займала гісторыя беларускага народа, і пачатак гэтаму быў пакладзены першым рэктарам БДУ У. І. Пічэтам, які выдаў больш за 130 навуковых прац, прысвечаных гісторыі права, эканомікі, культуры і палітычнай гісторыі Беларусі (пазней, у 1961 г., быў выдадзены збор яго прац «Белоруссия и Литва XV–XVI вв.»). Менавіта пад кіраўніцтвам У. І. Пічэты распрацоўвалі пытанні прававой гісторыі Беларусі А. В. Бурдзейка, В. Д. Дружчыц, Т. І. Забела, К. І. Таўсталес і інш.

Для развіцця юрыдычнай айчыннай навукі важнае значэнне мела заснаванне ў 1929 г. Беларускай акадэміі навук, у складзе якой была створана кафедра савецкага будаўніцтва і права, дзе даследаваліся пытанні арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарату, развіцця заканадаўства, прычыны злачыннасці, абагульняўся вопыт правапрымяняльнай дзейнасці.

Таксама важнай падзеяй стала стварэнне ў 1931 г. Мінскага інстытута савецкага будаўніцтва і права, які ў 1932 г. быў пераўтвораны ў Мінскі юрыдычны інстытут – галоўную ўстанову па падрыхтоўцы нацыянальных юрыдычных кадраў, падпарадкаваную Міністэрству юстыцыі БССР. У перадваенныя гады Мінскі юрыдычны інстытут узначальвалі: дацэнт А. Н. Юрашкевіч (1937–1938), дацэнт М. Н. Цвяткоў (1938), прафесар Штэйнграт (1938–1941), дацэнт І. С. Андрэйчык (1944–1945). У гэты перыяд у інстытуце ўжо былі спецыялізаваныя кабінеты і лабараторыі: кабінет крыміналістыкі, крыміналістычная лабараторыя, кабінеты гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, савецкага дзяржаўнага права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права і крымінальнага працэсу.

У 1935 г. шляхам аб'яднання Навукова-даследчага інстытута савецкага будаўніцтва і права і Інстытута філасофіі АН БССР быў створаны Інстытут філасофіі і права АН БССР, з якім узаемадзейнічалі і выкладчыкі БДУ. Аднак новая ўстанова не паспела належным чынам разгарнуць працу, бо ў 1938 г. многія яго супрацоўнікі былі рэпрэсіраваны. Увогуле ў канцы 1920-х гг. у Беларусі пачалася ідэалагічная кампанія па барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, вынікам чаго стала рэпрэсіраванне многіх выкладчыкаў і навукоўцаў Мінскага юрыдычнага інстытута і БДУ (У. І. Пічэта, Р. Я. Парэчын, М. М. Гуткоўскі, В. Д. Дружчыц і інш.), скарачэнне навуковых даследаванняў, што адмоўна паўплывала на развіццё як беларускай асветы і навукі ў цэлым, так і юрыдычнай навукі ў прыватнасці.

Цяжкія страты панесла беларуская прававая навука і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Таму ў першыя пасляваенныя гады з-за адсутнасці навуковых кадраў даследаванні па прававых праблемах амаль не праводзіліся. Ужо ў жніўні 1944 г. пачалося аднаўленне Акадэміі навук БССР і Мінскага юрыдычнага інстытута, які з 1945 па 1954 г. узначальваў кандыдат юрыдычных навук дацэнт Г. А. Павецьеў.

У 1954 г. Мінскі юрыдычны інстытут быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дэканам юрыдычнага факультэта стаў кандыдат юрыдычных навук (1949) дацэнт (1954) Я. М. Семярыхін (1914–1963), які працаваў у Мінскім юрыдычным інстытуце і на юрыдычным факультэце БДУ з 1947 па 1963 г. З 1947 па 1950 г. ён быў дырэктарам Мінскага філіяла Усесаюзнага юрыдычнага завочнага інстытута, а з 1954 па 1955 г. і з 1958 па 1959 г. – дэканам юрыдычнага факультэта. Пазней дэканамі факультэта былі дацэнт В. А. Дарогін (1956–1957, 1959–1964), дацэнт М. М. Меркушаў (1957–1958), прафесар І. М. Ігнаценка (1964–1965), дацэнт В. А. Шкурко (1965–1972), дацэнт В. Ф. Чыгір (1973–1983), прафесар В. Г. Ціхіня (1983–1989), прафесар В. М. Гадуноў (1989–2002). З 2002 г. факультэт узначальвае доктар юрыдычных навук прафесар С. А. Балашэнка.

У другой палове 1950-х гг. у СССР пачаўся працэс пашырэння праў саюзных рэспублік, у тым ліку і ў галіне заканатворчасці, што значна актывізавала юрыдычныя навуковыя даследаванні. Распрацоўка і прыняцце новых законаў (у тым ліку і кодэксаў) патрабавала ўдзелу ў заканатворчым працэсе прадстаўнікоў юрыдычнай навукі. У гэты перыяд у рэспубліцы быў пакладзены пачатак новаму кірунку гісторыка-прававой навукі – гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР (С. П. Маргунскі «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921–1925)», 1966). У 1958 г. выдадзена калектыўная праца «Очерки по истории государства и права БССР». У 1970–1976 гг. надрукаваны два тамы «Истории государства и права Белорусской ССР» (аўтары С. П. Маргунскі, І. І. Пацяружа, В. М. Арцёмава, Ю. П. Броўка, М. В. Сторажаў, В. І. Семянкоў, В. І. Шабайлаў, Я. А. Юхо і інш.). Выкананне гэтай значнай і вялікай працы стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву навукоўцаў АН БССР, БДУ, Мінскай вышэйшай школы МУС СССР.

У БДУ пашыраюцца даследаванні па ўсіх кірунках прававой навукі, у тым ліку па тэорыі дзяржавы і права (В. А. Дарогін, С. Р. Драбязка), канстытуцыйным і адміністрацыйным праве (А. А. Галаўко, Л. А. Прыходзька, А. Ц. Лейзераў, А. М. Крамнік), гісторыі дзяржавы і права Расіі (Б. Я. Бабіцкі, А. С. Фарфель, Э. А. Калініна, У. П. Сярэбраннікаў). Быў выдадзены шэраг прац: Я. А. Юхо «Правовое положение населения Белоруссии в XVI в.» (1978), А. А. Галаўко «Деятельность Советов Белоруссии по осуществлению экономической политики в деревне в 1927–1936 годах» (1968), І. І. Марціновіч «История суда в БССР» (1961), «Адвокатура в БССР» (1973) і інш.

Складаным і супярэчлівым пытанням савецкага будаўніцтва і права прысвяцілі свае навуковыя працы В. А. Дарогін («Суверенитет в советском государственном праве», 1948), С. Р. Віхараў («Суверенитет Белорусской ССР в составе Союза ССР», 1958), С. Р. Драбязка («Право и материально-техническая база коммунизма», 1967), А. Ц. Лейзераў («Конституционный принцип гласности работы Советов народных депутатов», 1981), А. М. Абрамовіч («Государственное управление строительством в СССР», 1982), А. Г. Цікавенка («Начальник и подчиненный. Правовые аспекты служебных отношений», 1984), А. А. Галаўко

(«БССР – суверенное социалистическое государство», 1989), А. М. Крамнік («Адміністрацыйныя паўнамоцтвы сельскага Савета дэпутатаў працоўных», 1974), Я. М. Тагуноў («Народный контроль над деятельностью аппарата управления местных Советов», 1975), П. К. Еўдакімаў («Ответственность лиц, ведущих паразитический образ жизни», 1963) і інш.

Аб’ектам увагі навукоўцаў-цывілістаў сталі праблемы абавязацельнага, жыллёвага права, грамадзянска-прававога забеспячэння праў і інтарэсаў грамадзян і іншыя пытанні. Былі выдадзены працы В. Ф. Чыгіра («Договор подряда по капитальному строительству», 1958; «Советское жилищное право», 1968), Ф. І. Гаўзэ («Обязательственное право», 1968; «Социалистический гражданско-правовой договор», 1972), А. М. Рамановіч, В. В. Левага, Я. А. Ціханенкі і інш. Пазней праблемы тэорыі грамадзянскага права пачалі распрацоўваць В. М. Гадуноў, Г. С. Драбязка, У. А. Раманенка, С. П. Сакалоў, І. М. Шчамялёва і інш. Пад кіраўніцтвам В. Ф. Чыгіра склалася навуковая школа грамадзянскага права.

У сферы шлюбна-сямейных праваадносін шырока вядомымі сталі даследаванні прафесара М. Р. Юркевіча («Семья в современном обществе», 1964; «Заключение брака по советскому праву», 1965). Дзейнасці судовых органаў і дзяржаўнага арбітражу, а таксама тэарэтычным праблемам грамадзянскага працэсуальнага права прысвечаны манаграфіі С. В. Курылёва («Объяснение сторон как доказательство в советском гражданском процессе», 1956; «Основы теории доказательства в советском правосудии», 1969). У публікацыях О. С. Курылёвай, А. А. Войціка, Х. Т. Мялешкі, Н. І. Красоўскай, В. П. Дуюна, Т. М. Петачэнкі, Т. І. Каробкінай, Г. Б. Шышко разглядаліся шматлікія пытанні працоўнага права. Самыя актуальныя праблемы грамадзянска-працэсуальнага права адлюстраваны ў даследаваннях Т. А. Бяловай, І. М. Калядкі, І. М. Казей, В. В. Ціхановіча, В. Г. Ціхіні, М. Р. Юркевіча і інш. Склалася беларуская школа грамадзянска-працэсуальнага і працоўнага права.

Цесна былі звязаны з жыццём даследаванні па крымінальна-прававой тэматыцы. Навукоўцы, якія займаліся пытаннямі крымінальнага права, дапамагалі праваахоўным органам юрыдычна кваліфікаваць супрацьпраўныя дзеянні. Пра гэта сведчаць назвы выдадзеных прац: І. І. Гарэлік «Квалификация преступлений, опасных для жизни и здоровья» (1973) і «Ответственность за оставление в опасности» (1960); І. С. Цішкевіч «Условия и пределы необходимой обороны» (1989) і «Приготовление и покушение по советскому уголовному праву» (1958); П. А. Дубавец «Ответственность за телесные повреждения по советскому уголовному праву» (1964); К. В. Кічыгіна «Ответственность за нарушение безопасности движения городского транспорта» (1966). Пазней праблемы крымінальнай навукі знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях В. А. Шкурко, М. М. Меркушава, А. У. Баркова, У. М. Хоміча, І. А. Грунтова, М. А. Бабія і інш.

Значную дапамогу практыцы аказвалі выданні працэсуалістаў: Я. А. Мацвіенкі «Судебная речь» (1967), «Приговор суда и его исполнение» (1968); С. П. Бякешкі, Я. А. Мацвіенкі «Подозреваемый в советском уголовном процессе» (1969); В. М. Шпілёва «Содержание и формы уголовного судопроизводства» (1974). Праблемы крымінальнага працэсу, арганізацыі і дзейнасці пракуратуры распрацоўваліся С. П. Бякешкам, В. М. Бібілай, А. А. Данілевічам.

Вучоныя факультэта актыўна праводзілі даследаванні праблем крыміналістыкі, судовай псіхалогіі і інш. Былі апублікаваны працы: А. В. Дулава («Вопросы теории судебной экспертизы», 1953; «Введение в судебную психологию», 1970; «Основы психологического анализа на предварительном следствии», 1973; «Судебная психология», 1970); М. М. Гапановіча («Опознание в судопроизводстве», 1975); І. А. Матусевіч («Изучение личности обвиняемого в процессе предварительного расследования преступлений», 1975); Р. А. Шумака («Бухгалтерский анализ как метод расследования преступлений», 1985) і інш.

Ва ўзаемадзеянні з вучонымі АН Беларусі ажыццяўляліся даследаванні пытанняў землекарыстання, аховы прыроды, арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і інш. Выйшлі манаграфіі М. В. Сторажава «Правовое положение колхозов на современном этапе» (1975), «Правовой режим мелиорированных земель» (1986), «Материальная ответственность колхозников» (1971).

Міжнародная дзейнасць Беларускай ССР асвятлялася ў працах Ю. П. Броўкі, Л. В. Паўлавай і іншых выкладчыкаў БДУ. Значным дасягненнем у гэтай сферы сталі манаграфіі Ю. П. Броўкі «Международная правосубъектность БССР» (1967) і «Белорусская ССР – суверенный участник международного общения» (1974).

Навукоўцы факультэта прымалі ўдзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў, у тым ліку Беларускай савецкай энцыклапедыі. Па іх ініцыятыве ў 1989 г. быў выдадзены «Юрыдычны слоўнік». Юрысты-гісторыкі (Я. А. Юхо, Т. І. Доўнар, Л. В. Паўлава і інш.) удзельнічалі ў перавыданні знакамітага помніка права – Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. (1989), падрыхтоўцы шэрагу энцыклапедычных выданняў: «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 т. (1994–2003), «Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік» (1995), «Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя» ў 2 т. (2005–2006) і інш.

З набыццём рэспублікай рэальнага суверэнітэту пачаўся якасна новы этап развіцця беларускай юрыдычнай навукі, які праявіўся ва ўсіх яе галінах і напрамках. Дзеючая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвясціла сваёй мэтай пабудову сацыяльнай дэмакратычнай прававой дзяржавы, што запатрабавала комплекснага падыходу да вывучэння прававых, эканамічных, сацыяльных, палітычных

аспектаў рэфармавання дзяржавы і грамадства. Аб’яднаныя намаганні беларускіх вучоных-юрыстаў былі накіраваны на выпрацоўку тэарэтычных падстаў, шляхоў і сродкаў ажыццяўлення прававой рэформы, у тым ліку на пошук найбольш эфектыўных спосабаў рэфармавання грамадскіх адносін у мэтах забеспячэння паступальнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Прававая навука на юрыдычным факультэце істотна змянілася. Яна была заклікана фарміраваць стаўленне да права як сродку ўдасканалення і гарманізацыі грамадскіх адносін, у тым ліку і сродку абароны неад’емных праў і свабод чалавека.

Перад вучонымі юрыдычнага факультэта сталі новыя задачы – вызначыць перспектывы развіцця прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь, шляхі і сродкі ўдасканалення палітычнай сістэмы, сфармуляваць тэарэтычныя асновы паспяховай і эфектыўнай праватворчасці, унесці прапановы па ўдасканаленні заканадаўства і г. д. У сувязі з гэтым на факультэце перш за ўсё былі вызначаны найбольш важныя і актуальныя прававыя праблемы. З улікам айчыннага гістарычнага вопыту і прагрэсіўных напрацовак сусветнай юрыспрудэнцыі пачалі даследавацца фундаментальныя тэарэтычныя праблемы дзяржавы і права, выпрацоўваліся практычныя рэкамендацыі па ўдасканаленні дзеючага заканадаўства.

Новы этап развіцця ўніверсітэцкай юрыдычнай навукі быў звязаны з карэннай рэарганізацыяй усяго грамадска-палітычнага ладу. Пачаўся працэс дэмакратызацыі грамадства і фарміравання якасна новай прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, у якім прынялі актыўны ўдзел вучоныя юрыдычнага факультэта БДУ.

У сувязі з пераменамі даследчыкі заўсёды шукаюць філасофскія і ідэалагічныя арыенціры, якія б дапамагалі навуковаму асэнсаванню рэчаіснасці. Для вырашэння канкрэтных задач дзяржаўна-прававога будаўніцтва неабходна глыбокае разуменне асноватворных паняццяў: «дзяржава і права», «дзяржава і асоба», «сацыяльная прававая дзяржава» і інш. Выданні навукоўцаў юрыдычнага факультэта канца XX ст. (манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы і інш.) адлюстроўваюць новыя тэндэнцыі ў айчыннай прававой навуцы. У публікацыях вучоных-тэарэтыкаў (А. М. Абрамовіча, С. Р. Драбязкі, А. Г. Цікавенкі і інш.) надавалася ўвага тэарэтычным падставам удасканалення дзяржаўнага апарату і права, шляхоў пабудовы дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь. Гісторыкі права (Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо) працягвалі даследаваць дзяржаўнасць і права Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду, асвятляць у сваіх працах гістарычныя асаблівасці і пераемнасць дзяржаўна-прававога будаўніцтва, прымалі актыўны ўдзел у перавыданні старажытных нарматыўных актаў. Так А. Ф. Вішнеўскі і Я. А. Юхо апублікавалі кнігу «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (1998, 2003), быў перавыдадзены Статут 1566 г. (2003) і інш. Таксама пачалася падрыхтоўка шматтомнай працы па гісторыі дзяржаўнасці і права Беларусі са старажытнасці да нашых дзён і распрацоўка гісторыі айчыннага канстытуцыяналізму – выдадзена кніга Р. А. Васілевіча, Т. І. Доўнар, Я. А. Юхо «Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі» (2001). Працягваліся даследаванні ў сферы міжнароднага права.

На кафедры канстытуцыйнага права праводзіліся даследаванні новага канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, сістэмы дзяржаўнай улады, узаемаадносін дзяржавы і чалавека, сістэмы мясцовага самакіравання, прававога статусу грамадзяніна і чалавека. Выдадзены шэраг кніг Р. А. Васілевіча: «Парламент Республики Беларусь. Конституционно-правовой аспект» (1995); «Конституция и некоторые вопросы защиты прав и свобод гражданина» (1998); «Органы государственной власти Республики Беларусь» (1998); «Нормативно-правовые акты Республики Беларусь» (2000); «Конституция Республики Беларусь. Научно-практический комментарий» (2000) і інш.

Актуальным праблемам права былі прысвечаны кнігі І. І. Марціновіч «Судебно-правовая реформа в Республике Беларусь» (у суаўт. з М. І. Пастуховым, 1995) і інш.; В. Ф. Чыгіра «Приватизация жилья» (1993), «Юридические лица» (1994), «Кредиты и субсидии на приобретение и оплату жилья» (1996); І. С. Цішкевіча «Квалификация хищений имущества» (1996) і інш.

Важным напрамкам юрыдычнай навукі Беларусі сталі даследаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, у тым ліку кіравання прыродакарыстаннем і аховай навакольнага асяроддзя (С. А. Балашэнка); праў грамадзян у сферы навакольнага асяроддзя (Т. І. Макарава); аховы навакольнага асяроддзя гарадоў (Н. А. Шынгель); прыродных тэрыторый, якія ахоўваюцца (В. Я. Лізгара); прававога рэжыму лясоў (А. У. Лаеўская). Выдадзены кнігі С. А. Балашэнкі, Т. І. Макаравай «Международно-правовая охрана окружающей среды и права человека» (1999); С. А. Балашэнкі «Государственное управление в области охраны окружающей среды» (2000); С. А. Балашэнкі, А. У. Лаеўскай, Т. І. Макаравай «Право на благоприятную окружающую среду (как его защитить?)» (2000) і інш.

Аб актывізацыі навуковых даследаванняў на юрыдычным факультэце сведчаць шматлікія калектыўныя працы навукоўцаў, а таксама 25 выпускаў навуковага зборніка «Право и демократия» (1988–2014).

Заканамерным этапам дынамічнага развіцця ўніверсітэцкай навукі стала з’яўленне ў Беларусі новых універсітэтаў, факультэтаў міжнародных адносін і сацыяльных тэхналогій, аснову кадраў якіх склалі вучоныя юрыдычнага факультэта БДУ, а таксама заснаванне на юрыдычным факультэце нашага ўніверсітэта кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, аддзяленняў паліталогіі і эканамічнага права.

Адной з найважнейшых функцый юрыдычнай навукі заўсёды была распрацоўка падручнікаў і дапаможнікаў. Навукоўцамі факультэта ў канцы XX ст. выдадзены падручнікі і вучэбныя дапаможнікі: «Уголовное право» ў 2 т. (1978); «Крымінальнае права Беларусі» (1997); «Гражданское право БССР» у 3 т. (1975–1978); «Гражданский процесс» у 4 т. (1979–1982); «Уголовный процесс» у 3 ч. (1979); «Советское строительство» (1979); «Суд и правосудие в БССР» (1977); «Административное право Республики Беларусь» (1997); «Международное частное право» (1995); «Трудовое право» (1997), а таксама каля дзясятка вучэбных дапаможнікаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Працэс выпуску навуковай і вучэбнай літаратуры асабліва актывізаваўся ў XXI ст. Так, выйшлі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі: «Конституционное право Республики Беларусь» (2001, 2003, 2005, 2006, 2009); «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (2005, 2007, 2008, 2011, 2014); «Наследственное право феодальной Беларуси (по законодательству ВКЛ)» (2002); «Административное право» (2008, 2010, 2012, 2013); «Гражданское право» ў 2 ч. (2000, 2002); «Гражданское право: учебник» у 3 т. (2008, 2010, 2011); «Гражданский процесс. Общая часть» (2000, 2006); «Гражданский процесс. Особенная часть» (2002, 2007); «Гражданский процесс зарубежных стран» (2005); «Уголовное право» (2002, 2011, 2014); «Судоустройство» (2001, 2010); «Налоговое право» (2006), «Налоговые органы Республики Беларусь» (2006); «Курс финансового права» (2009, 2010); «Финансовое право» (2006, 2008, 2009); «Банковское право: Общая часть» (2007); «Банковское право: Особенная часть» (2007); «Аграрное право» (2003); «Земельное право» (2004); «Экологическое право» (2008, 2013); «Курс трудового права» ў 3 т. (2010, 2014); «Трудовое право» (2002, 2004, 2006, 2010, 2011); «Европейское частное право» (2010); «Институционное право Европейского союза» (2010); «Правовое регулирование внутреннего рынка Европейского союза» (2010); «Основы управления интеллектуальной собственностью» (2010); «Политология» (2010, 2011, 2012); «Теория принятия политических решений: функциональный подход» (2012); «Основы идеологии белорусского государства» (2010, 2011, 2012) і інш. Друкаваліся таксама шматлікія вучэбна-метадычныя комплексы, навукова-практычныя каментарыі да грамадзянскага, крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянска-працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў, практыкумы па гаспадарчаму і грамадзянскаму працэсах, крыміналістыцы і інш., разнастайныя даведнікі па прававых пытаннях і г. д. Акрамя таго, на працягу 2007–2014 гг. па ініцыятыве дэкана факультэта С. А. Балашэнкі была выдадзена «Белорусская юридическая энциклопедия» ў 4 т.

У гэты перыяд важным кірункам дзейнасці юрыдычнага факультэта стаў удзел яго супрацоўнікаў у навуковым каменціраванні кодэксаў, законаў і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама ў распрацоўцы і навуковай экспертызе праектаў нарматыўных прававых актаў.

У сувязі з новымі тэндэнцыямі ў праве і інтэнсіўнай нарматворчай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь выкладчыкі юрыдычнага факультэта ў пачатку XXI ст. актывізавалі навуковыя даследаванні. Так, шмат увагі надаваў праблемным пытанням канстытуцыйнага права Р. А. Васілевіч у манаграфіях «Право в нашей жизни» (2002), «Конституционное правосудие на защите прав и свобод человека» (2003), «Белорусское государство на рубеже веков» (2006, 2007), «Конституционная основа национальной правовой системы» (2009), «Правонарушения. Закон. Ответственность» (2011), «Конституционное правосудие» (2012) і інш.

Праблемам адміністрацыйнага права былі прысвечаны кнігі А. М. Крамніка «Административное право» (2008), В. І. Чуприс «Теоретико-правовые проблемы государственной службы Республики Беларусь» (2009).

Экалагічнае права даследавалася ў манаграфіях С. А. Балашэнкі «Государственное управление в области охраны окружающей среды» (2000), Т. І. Макаравай «Эколого-правовой статус гражданина Республики Беларусь» (2004), Н. А. Карповіч «Экологическая функция государства» (2010) і інш.

Працягвалася распрацоўка цывілістычных праблем у манаграфіях В. Ф. Чыгіра «Физические и юридические лица как субъекты гражданского права» (2000), «Договор найма жилого помещения» (2001), «Сроки. Исковая давность» (2005), «Сделки в гражданском праве» (2006), «Юридические лица (коммерческие и некоммерческие организации) Республики Беларусь» (2012); В. М. Гадунова «Правовое регулирование реализации товаров для государственных нужд» (2002); А. У. Лаеўскай «Судебная защита права на благоприятную окружающую среду» (2003), «Правовые основы создания общественных объединений в Республике Беларусь» (2006); А. А. Свадкоўскай «Заключение гражданско-правового договора с отступлением от принципа его свободы» (2006) і інш.

Пытанням грамадзянска-працэсуальнага, фінансавага, падаткавага і банкаўскага права былі прысвечаны манаграфіі: В. С. Камянкова «Экономика и правосудие: вопросы теории и практики» (2006); В. М. Раманавай «Защита чести, достоинства и деловой репутации в общих и хозяйственных судах» (2007); Я. І. Функа «Совершенствование правовых средств производственной кооперации (кооперирования) путем введения особого типа договора» (2007), «О форс-мажоре и “затруднениях” (в том числе в свете ситуации на валютном рынке Республики Беларусь) на основе права Республики Беларусь и международных актов» (2013); Ю. П. Доўнар «Защита банковских вкладов: сравнительно-правовой аспект» (2007), «Государственное регулирование банковских вкладов (2008) і інш.

Працоўныя праваадносіны даследаваліся ў навуковых працах К. Л. Тамашэўскага і А. А. Войціка «Трудовые конфликты» (2004); К. Л. Тамашэўскага «Система источников трудового права Беларуси» (2013),

«Изменение трудового договора и правоотношения» (2014); Т. А. Паставалавай «Трудовое право Европейского союза: теория и практика» (2015) і інш.

У сферы крымінальнага права і працэсу, судаводства з'явіліся манаграфіі І. І. Марціновіч «Адвокатура Беларуси: история и современность» (2002); В. М. Бібілы «Судебная власть в уголовном судопроизводстве» (2001); І. А. Грунтова «Принцип личной виновной ответственности в уголовном законодательстве» (2012); В. В. Марчука «Теория квалификации преступлений» (2014); В. І. Самарына «Международно-правовая помощь по уголовным делам: уголовно-процессуальный аспект» (2012); Л. Л. Зайцавай і В. С. Жыгуліч «Сокращенное судебное следствие в уголовном процессе Республики Беларусь» (2013). Прафесар В. М. Бібіла апублікавала працы «Проблемы юриспруденции: избранные труды» (2010), «Проблемы правоведения: избранные труды» (2011).

Развіваліся навуковыя даследаванні і ў сферы крыміналістыкі, аб чым сведчаць манаграфіі А. В. Дулава і А. С. Рубіса «Основы формирования теории криминалистического доказывания» (2005); А. В. Лапіна «Криминалистическое оружиеведение» (2005); А. Я. Гучка «Криминалистическая структура преступления» (2007) і «Модели решения исследовательских задач криминалистики» (2013).

Актыўныя навуковыя даследаванні праводзілі навукоўцы кафедры паліталогіі. Так, была надрукавана калектыўная (С. В. Рашэтнікаў і інш.) манаграфія «Государственная политика и управление в Республике Беларусь» (2010), а таксама манаграфія А. П. Мельнікава «Политическая культура на постсоветском пространстве» (2014) і інш.

На юрыдычным факультэце пад кіраўніцтвам аўтарытэтных дактароў юрыдычных навук паступова сфарміраваўся шэраг навуковых школ:

- «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», заснавальнік Я. А. Юхо (1963), зараз навуковым кіраўніком з'яўляецца Т. І. Доўнар;
- «Прававое заканадаўства і заканамернасці яго ўдасканалення», заснавальнік С. Р. Драбязка (1972);
- «Праблемы тэорыі і метадалогіі дзяржавы і права», заснавальнік А. М. Абрамовіч (1988);
- «Тэорыя і практыка развіцця прававой дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавы», заснавальнік Р. А. Васілевіч (1994);
- «Юрыдычныя асобы і грамадзяне як суб'екты грамадзянска-прававых адносін: праблемы тэорыі і практыкі», заснавальнік В. Ф. Чыгір (1983);
- «Тэарэтычныя асновы судовых формаў абароны права (грамадзянскі працэсуальны аспект)», заснавальнікі М. Р. Юркевіч і В. Г. Ціхіня (1974);
- «Асновы і перспектывы прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», заснавальнік В. С. Камянкоў (2004);
- «Экалагічнае, прыродарэсурснае і аграрнае права», заснавальнік М. В. Сторажаў (1991), зараз навуковымі кіраўнікамі з'яўляюцца С. А. Балашэнка і Т. І. Макарава;
- «Фарміраванне і ўдасканаленне арганізацыі, стратэгіі і метадалогіі барацьбы са злачыннасцю», заснавальнік А. В. Дулаў (1965).

У складзе юрыдычнага факультэта ў 1995 г. сфарміравалася навуковая школа ў галіне палітычных навук. Яе заснавальнік – доктар палітычных навук С. В. Рашэтнікаў.

Прадстаўнікі навуковых школ пасляхова ўдзельнічаюць у выкананні дзяржаўных комплексных праграм навуковых даследаванняў, напрыклад: «Эканоміка і грамадства» (2006–2010), «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» (2011–2015) і інш.; многіх спецыяльных рэспубліканскіх праграм навуковых даследаванняў, напрыклад: «Прававое забеспячэнне інавацыйнага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь» (2006–2010), «Гісторыя станаўлення і развіцця дзяржаўнасці і прававой сістэмы Беларусі» (2006–2010), «Праблемы гарманізацыі цывілістычных і публічна-прававых метадаў рэгулявання ў кантэксце інавацыйнага развіцця эканомікі» (2011–2015), «Асновы ўстойлівага развіцця нацыянальнай прававой сістэмы ў XXI стагоддзі: метадалогія, тэорыя, практыка» (2011–2015) і інш. Прадстаўнікі навуковых школ удзельнічаюць у прававых даследаваннях у складзе часовых навуковых калектываў па дагаворах з Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў, выконваюць навукова-даследчую працу па заказе міністэрстваў (напрыклад, у 2006–2008 гг. па заказе Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь навукоўцы факультэта рэалізоўвалі спецыяльны даследчы праект).

Вынікі даследаванняў прадстаўнікоў навуковых школ адлюстраваны ў шматлікіх публікацыях, дзе звернута ўвага на асаблівасці і тэндэнцыі развіцця беларускай дзяржаўнасці і заканадаўства ва ўмовах глабалізацыі і рэгіяналізацыі, неабходнасці ўдасканалення прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь у кантэксце яе геапалітычнага становішча. Яны выкарыстоўваюцца пры выкладанні юрыдычных дысцыплін, падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і іншых вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў. У форме навуковых рэкамендацый і практычных прапаноў яны накіроўваліся ў праватворчыя органы Рэспублікі Беларусь, у Канстытуцыйны Суд, Вярхоўны Суд і Вышэйшы Гаспадарчы Суд Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншыя рэспубліканскія ўстановы. Напрыклад, былі выказаны прапановы па тэарэтыка-метадалагічным асновам удасканалення прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, удасканаленні юрыдычнай тэрміналогіі, праблемных пытаннях сістэматызацыі заканадаўства, эфектыўнай нарматворчасці і правапрымянення. Вынікі

навуковых даследаванняў выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы шматлікіх праектаў нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь.

Праблемныя і актуальныя пытанні ў сферы юрыспрудэнцыі даследуюцца прадстаўнікамі навуковых школ у цесным узаемадзеянні з усімі айчыннымі навуковымі арганізацыямі і міжнародным навуковым супольніцтвам, аб чым сведчаць сумесныя праекты даследаванняў і калектыўныя публікацыі. Увогуле дзейнасць айчынных навуковых школ, накіраваная найперш на ўдасканаленне дзяржаўнасці і прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца ў кантэксце сусветных прававых тэндэнцый.

Неабходнай умовай перспектыўнага развіцця факультэта з'яўляецца падрыхтоўка маладой змены, якая вызначыць будучае юрыдычнага факультэта і юрыдычнай навукі. Поспех у гэтым працэсе залежыць ад пераемнасці. Прафесарска-выкладчыцкі састаў факультэта надае гэтаму першасную ўвагу. На ўсіх кафедрах функцыянуюць навуковыя гурткі. Студэнты актыўна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, аб чым сведчыць іх удзел у міжнародных студэнцкіх навуковых канферэнцыях, якія штогод праходзяць на юрыдычным факультэце, у рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, а таксама шматлікія студэнцкія публікацыі ў рэспубліцы і за мяжой.

На працягу дзесяцігоддзяў юрыдычны факультэт з'яўляецца флагманам па падрыхтоўцы юрыдычных навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Выкладчыкі факультэта кіруюць аспірантамі і саіскальнікамі навуковых ступеней, прымаюць удзел у экспертызе і апаніраванні дысертацыйных даследаванняў і інш. Пры БДУ актыўна дзейнічаюць два доктарскія саветы па абароне дысертацый па прававых пытаннях. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе выкладчыкамі факультэта, аспірантамі і саіскальнікамі навуковых ступеней было абаронена звыш 80 кандыдацкіх і пяць доктарскіх дысертацый.

Традыцыйнымі на факультэце сталі штогадовыя навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, на якіх абмяркоўваюцца важнейшыя праблемы юрыдычнай навукі, адбываецца абмен вопытам з вучонымі іншых краін.

Важная традыцыя юрыдычнага факультэта – ушанаванне навукоўцаў старэйшага пакалення, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай прававой навукі. Пачатак гэтаму паклала кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, па ініцыятыве якой у 2011 г. была склікана Міжнародная навуковая канферэнцыя «Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі», прысвечаная памяці заснавальніка навуковай гісторыка-прававой школы Беларусі, доктара юрыдычных навук, прафесара Я. А. Юхо. Выйшла кніга, прысвечаная яго жыццю і навуковай дзейнасці, а таксама матэрыялы канферэнцыі, галоўныя артыкулы якіх адлюстроўвалі творчасць Я. А. Юхо, яго ўклад у развіццё гісторыі дзяржавы і права Беларусі, значэнне і пераемнасць яго ідэй у сучаснай гісторыка-прававой навуцы.

У 2012 г. адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Актуальные вопросы совершенствования правовой системы на современном этапе», прысвечаная 90-годдзю заснавальніка навуковай школы тэорыі дзяржавы і права, доктара юрыдычных навук, прафесара С. Р. Драбязкі. У 2014 г. адбыліся дзве канферэнцыі, прысвечаныя 90-годдзю заснавальніка цывілістычнай навуковай школы, доктара юрыдычных навук, прафесара В. Ф. Чыгіра, а таксама заснавальніка крыміналістычнай навуковай школы, доктара юрыдычных навук, прафесара А. В. Дулава.

У 2014 г. прайшоў круглы стол «Наука экологического, природоресурсного и аграрного права. Правовые механизмы охраны окружающей среды», прысвечаны памяці член-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара юрыдычных навук, прафесара М. В. Сторажава.

На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці выкладчыкі юрыдычнага факультэта працягваюць навуковую распрацоўку праблемных прававых пытанняў, займаюцца падрыхтоўкай маладой змены і інш. У цэнтры іх увагі – актуальныя праблемы тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага, грамадзянскага, гаспадарчага, экалагічнага, зямельнага, крымінальнага, працэсуальнага і іншых галін права. Актыўна даследуюцца пытанні беларуска-расійскай інтэграцыі, суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і гарантый яго забеспячэння ў прававой, эканамічнай, сацыяльнай сферах, імплементацыі міжнародна-прававых норм і міжнародных абавязацельстваў у нацыянальнае права і інш.

Вучоныя-юрысты ўносяць значны ўклад у працэс удасканалення арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарату, кадыфікацыю заканадаўства, распрацоўку новых форм і сродкаў забеспячэння законнасці як неабходнай умовы фарміравання грамадзянскай супольнасці і сацыяльнай прававой дзяржавы.

Такім чынам, універсітэцкая юрыдычная навука ў Беларусі прайшла доўгі шлях развіцця, на працягу якога роля і значэнне юрыдычнага факультэта БДУ як вядучага цэнтра вышэйшай юрыдычнай адукацыі і навуковых даследаванняў у галіне права ўвесь час расце.

***С. А. Балашэнка***,
доктар юрыдычных навук, прафесар,
дэкан юрыдычнага факультэта БДУ

***Т. І. Доўнар***,
доктар юрыдычных навук,
прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права
юрыдычнага факультэта БДУ